Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 3 САКАВІКА 1977 г.

№ 7 (1157)

Цана 2 кап.

# САВЕТ ТРЫМАЮЦЬ КАМУНІСТЫ

**28 ЛЮТАГА АДБЫЎСЯ СХОД КАМУНІСТАЎ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА З ПАРАДКАМ ДНЯ «АБ ХОДЗЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ «МЕРАПРЫЕМСТВАЎ РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БДУ ПА ВЫКАНАННЮ РАШЭННЯЎ XXV З'ЕЗДА КПСС» І ЗАДАЧАХ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ 60-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА. З ДАКЛАДАМ, ЯКІ МЫ ПУБЛІКУЕМ У СКАРАЧЭННІ, ПЕРАД КАМУНІСТАМІ ВЫСТУПІЎ РЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ АКАДЭМІІ НАВУК БССР ПРАФЕСАР У. М. СІКОРСКІ.**

Прайшоў год пасля XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які вызначыў палітычную лінію партыі, Савецкай дзяржавы на бліжэйшыя гады і больш аддаленую перспектыву.

Усе працоўныя калектывы краіны, партыйныя арганізацыі завяршаюць у гэтыя дні аналіз сваёй дзейнасці ў першым годзе дзесятай пяцігодкі, намячаюць новыя рубяжы ў адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда КПСС, кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК, пастановамі ЦК КПСС аб разгортванні Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва і аб 60-годдзі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Гаворачы аб выніках таго, што зроблена, мы маем усе падставы адзначыць, што ў цэлым наш калектыў пачаў дзесятую пяцігодку нядрэнна, дабіўся пэўных станоўчых рэзультатаў, якія атрымалі высокую ацэнку партыі і ўрада. Беларускі дзяржаўны універсітэт прызнан пераможцай у рэспубліканскім і Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за 1976 год, **і нашаму калектыву прысуджан пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.**

Усё, чаго дасягнуў наш калектыў, — гэта, перш за ўсё, рэзультат работы партыйнай арганізацыі універсітэта, вялікай арміі камуністаў, якія ідуць у авангардзе ўсіх добрых спраў і пачынанняў калектыву.

Партыйны камітэт і рэктарат прынялі меры па перабудове арганізатарскай і выхаваўчай работы ў духу патрабаванняў XXV з'езда КПСС і з улікам крытыкі, выказанай кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, першым сакратаром ЦК КПБ тав. П. М. Машэравым у справаздачным дакладзе ЦК XXVIII з'езду Кампартыі Беларусі. Партыйны камітэт, пярвічныя партыйныя арганізацыі ўзмацнілі работу па выхаванню камуністаў у духу строгага выканання Праграмы і Статута партыі, партыйнага абавязку. Партыйны камітэт і партыйныя бюро сістэматычна заслухоўваюць на сваіх пасяджэннях камуністаў аб выкананні імі партыйных абавязкаў. Па-дзелавому такія абмеркаванні праходзяць на механіка-матэматычным факультэце (сакратар партбюро тав. Р. Вальвачоў), геаграфічным (сакратар партбюро тав. С. Бачурын) і іншых факультэтах. Пры гэтым партыйныя арганізацыі строга спаганяюць з тых камуністаў, якія дапускаюць парушэнне норм партыйнага жыцця, амаральныя паводзіны, прыніжаюць высокае званне камуніста. Так, толькі на працягу апошняга года партыйным камітэтам былі прыцягнуты да партыйнай адказнасці 9 камуністаў.

У практыку нашай работы ўсё больш уваходзяць сумесныя пасяджэнні партыйнага камітэта і рэктарата, партыйнага камітэта і савета універсітэта, што дазваляе нам выпрацоўваць сумесную лінію па найважнейшых пытаннях жыцця універсітэта. На адным з такіх сумесных пасяджэнняў у канцы снежня мінулага года абмяркоўвалася пытанне аб узмацненні ролі і дзейснасці крытыкі і самакрытыкі, аб паляпшэнні якасці і эфектыўнасці работы партыйных арганізацый, дэканатаў, аддзелаў і служб па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. З дакладам выступіў сакратар парткома тав. М. Гарашчук. На гэтым пасяджэнні быў дан крытычны аналіз становішча спраў на асобных факультэтах, кафедрах і ў структурных падраздзяленнях універсітэта.

Рэктарат і партком не толькі крытыкавалі недахопы, але і рабілі там, дзе гэта было неабходна, адпаведныя арганізацыйныя вывады, прынялі меры па ўмацаванню шэрагу служб вопытнымі кіраўнікамі — камуністамі.

Далейшаму развіццю крытыкі і самакрытыкі садзейнічала абмеркаванне на партыйных сходах задач камуністаў у святле рашэнняў **ЦК КПСС** «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі» і рашэння **ЦК КПБ** аб рабоце Віцебскага абкома **КПБ**. Партком і рэктарат пастаянна арыентуюць дэканаты, кафедры, пярвічныя партыйныя арганізацыі на смелае разгортванне крытыкі і самакрытыкі, стварэнне па-сапраўднаму творчай, дзелавой абстаноўкі ва ўсх падраздзяленнях.

Разам з тым мы не можам сказаць, што ў справе развіцця крытыкі і самакрытыкі мы ў поўнай меры выканалі патрабаванні XXV з'езда.

Тлумачачы сутнасць метаду крытыкі і самакрытыкі, тав. Л. І. Брэжнеў гаварыў на XXV з'ездзе, што яна заключаецца ў тым, «каб усе бакі дзейнасці той ці іншай арганізацыі, таго ці іншага работніка атрымлівалі аб'ектыўную ацэнку; у тым, каб маючыяся недахопы падвяргаліся ўсебаковаму аналізу з мэтай іх ліквідавання». Нельга дапускаць, падкрэсліваецца ў пастанове ЦК КПСС «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі», «каб крытыка падмянялася дэмагогіяй і ачарненнем. Трэба, каб яна, як указваў У. І. Ленін, была «таварыскай, прамой, далёкай ад дыпламатыі і дробязных разлікаў». Яе каштоўнасць вызначаецца не рэзкасцю выказванняў, а праўдзівасцю, доказнасцю, грамадскай значнасцю ўзнятых пытанняў».

На жаль, мы сустракаемся яшчэ часам з адхіленнем ад гэтых установак партыі, з няправільнымі адносінамі да крытычных заўваг.

Ажыццяўляючы мерапрыемствы, намечаныя рэктаратам і парткомам, шмат увагі мы ўдзяляем павышэнню ролі пярвічных партыйных арганізацый, ролі партыйных сходаў як школы выхавання камуністаў, а таксама ролі саветаў факультэтаў.

У сваёй арганізатарскай і выхаваўчай рабоце па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС рэктарат і партком шмат увагі ўдзяляюць паляпшэнню работы з кадрамі. Удакладнена наменклатура парткома і пярвічных партыйных арганізацый універсітэта. Адпавядаючыя гэтай наменклатуры работнікі павінны абавязкова зацвярджацца на парткоме або партыйных бюро факультэтаў. Гэта дае магчымасць рэктарату і парткому больш глыбока ўнікаць у гэтыя пытанні пры падборы і вылучэнні кадраў.

Не менш важнае значэнне мы надаем выхаваўчай рабоце з кадрамі. Распрацаван спецыяльны план работы з кіраўнікамі факультэтаў і структурных падраздзяленняў.

Аднак і ў гэтай галіне зроблена далёка не ўсё неабходнае. Мы неаднаразова на пасяджэннях савета, парткома, рэктарата гаварылі аб слабай выканаўчай дысцыпліне некаторых нашых работнікаў, неаператыўным выкананні нашых уласных калектыўна прынятых рашэнняў, дырэктыў і інструкцый вышэйстаячых арганізацый, але справа паляпшаецца слаба. Як бачна, ёсць тут значная частка віны рэктарата і парткома, якія часам вельмі доўга займаюцца ўгаворваннямі там, дзе трэба выкарыстаць рашучыя меры.

І ўжо зусім недапушчальна, калі асобныя камуністы несур'ёзна адносяцца да выканання важных, адказных партыйных даручэнняў. А такія факты таксама, на жаль, маюць месца. Так, выкладчыкі кафедры філасофіі тав. А. Елсукоў і палітэканоміі гуманітарных факультэтаў А. Глебаў неаднаразова зрывалі занятк з рэзервам прапагандыстаў Кастрычніцкага РК КПБ г. Мінска. Фактычна самаўхіліўся ад выканання важнага даручэння — кіраўніцтва факультэтам грамадскіх прафесій яго дэкан — дацэнт кафедры педагогікі тав. В. Мешчаракоў. У апошні час заняткі на факультэце амаль спыніліся. Рэктарат прыняў рашэнне аб вызваленні яго ад абавязкаў дэкана, але будзе правільна, калі партком сур'ёзна спытае з камуніста тав. В. Мешчаракова за нядбайнае выкананне ускладзенага на яго даручэння.

Хацелася б некалькі слоў сказаць аб развіцці сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце, аб умацаванні кіраўніцтва з боку парткома работай прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый. Належыць адзначыць, што за апошні час, асабліва ў 1976 г., арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце значна палепшылася. Распрацаваны і ўдакладнены ўмовы сацыялістычнага спаборніцтва паміж падраздзяленнямі універсітэта па пэўнай бальнай сістэме, хаця гэту сістэму, як падказвае вопыт, нам неабходна ўдасканальваць.

Канешне, у галіне арганізатарскай і выхаваўчай работы намі зроблена далёка не ўсё неабходнае, і гэту работу нам належыць дасканаліць і надалей. Галоўную задачу ў гэтай галіне партком і рэктарат бачаць у тым, каб няспынна павышаць патрабавальнасць да кожнага камуніста, да кіраўнікоў усіх рангаў, каб стварыць абстаноўку высокай узаемнай патрабавальнасці і разам з тым уважлівых і клапатлівых адносін да людзей.

У галіне вучэбнай работы, у адпаведнасці з рашэннямі **XXV** з'езда КПСС, Пленума **ЦК** і распрацаванымі мерапрыемствамі партыйны камітэт, рэктарат, дэканаты, партыйныя арганізацыі факультэтаў, кафедры канцэнтравалі свае намаганні на паляпшэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, на перабудове ўсёй нашай вучэбнай метадычнай работы ў святле патрабаванняў новых вучэбных планаў, сучаснага навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэтыя намаганні прынеслі пэўныя станоўчыя рэзультаты. Своечасова здзейснен пераход на новыя вучэбныя планы на ўсіх факультэтах дзённай формы навучання. Пачаўся такі пераход на вячэрняй форме навучання. Перагледжана большасць спецкурсаў, уведзены новыя, накіраваныя на паглыбленне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з улікам сучасных дасягненняў навукі і тэхнікі. Па ўсіх прыродазнаўчых спецыяльнасцях пашырана матэматычная падрыхтоўка, уведзены новыя фізіка-матэматычныя дысцыпліны, непасрэдна звязаныя з навукова-тэхнічным прагрэсам. Змест курсаў сацыяльна-эканамічных дысцыплін узбагачан палажэннямі і вывадамі, якія змяшчаюцца ў дакументах **XXV** з'езда КПСС, у рашэннях партыі і ўрада, навейшымі дасягненнямі грамадскай навукі і практыкі камуністычнага будаўніцтва.

Аналіз праведзенай праверкі і іншай інфармацыі, якая маецца ў распараджэнні рэктарата і парткома, сведчыць аб тым, што выкладчыкі універсітэта ў большасці сваёй на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні чытаюць лекцыі і праводзяць іншыя віды вучэбных заняткаў. Больш увагі дэканатамі і кафедрамі пачало ўдзяляцца арганізацыі і кантролю самастойнай работы студэнтаў, асабліва першых курсаў.

Значна актывізавалася навукова - метадычная работа кафедр і факультэтаў, аб чым сведчыць праведзеная ў пачатку лютага гэтага года агульнауніверсітэцкая навукова-метадычная канферэнцыя на тэму «XXV з'езд КПСС і задачы павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй».

Далейшае ўдасканальванне вучэбнай і метадычнай работы знайшло сваё адлюстраванне ў рэзультатах нядаўна праведзенай зімовай экзаменацыйнай сесіі. Абсалютная паспяховасць студэнтаў па дзённай форме навучання павысілася на 0,5 працэнта і склала 93,1 працэнта. Паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах больш высокая: па выніках зімовай сесіі яна склала звыш 98 працэнтаў. Кафедры грамадскіх навук у адпаведнасці з патрабаваннямі XXV з'езда КПСС пачалі больш увагі ўдзяляць фарміраванню камуністычнай перакананасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі будучых спецыялістаў.

Абсалютная паспяховасць павысілася на ўсіх факультэтах, за выключэннем фізічнага, механіка-матэматычнага, юрыдычнага, на якіх, на жаль, адбылося зніжэнне паспяховасці. Па універсітэту значная колькасць студэнтаў — звыш 6 працэнтаў — атрымала нездавальняючыя адзнакі, каля 4 працэнтаў — толькі здавальняючыя і вялікая колькасць студэнтаў мае так званыя «змешаныя» адзнакі, у тым ліку і тройкі. Відавочна, што пасрэдны студэнт сёння — гэта пасрэдны спецыяліст заўтра. Усё яшчэ высокі працэнт адсеву. Толькі за першы семестр бягучага навучальнага года выключана 68 студэнтаў стацыянара.

Знізілася паспяховасць на аддзяленнях гісторыі, правазнаўства, геаграфіі і біялагічным завочнага факультэта. Многія студэнты-завочнікі вучацца толькі на здавальняюча, тут таксама высокі працэнт адсеву.

Сур'ёзную заклапочанасць выклікаюць рэзультаты зімовай экзаменацыйнай сесіі на вячэрнім аддзяленні. Тут адбылося істотнае зніжэнне паспяховасці па ўсіх факультэтах, за выключэннем філалагічнага, біялагічнага і факультэта радыёфізікі і электронікі. Нам неабходна тэрмінова выпраўляць становішча на вячэрнім аддзяленні.

(Заканчэнне на 2-й стар.).



Усесаюзны камсамольскі

# НАСУСТРАЧ ЮБІЛЕЮ

На факультэце журналістыкі прайшоў Усесаюзны камсамольскі сход «Камуністычную ідэйнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю — кожнаму камсамольцу».

Даючы ацэнку грамадскай рабоце на факультэце, сакратар камітэта камсамола У. Грыняк адзначыў, што большасць студэнтаў мае грамадскія даручэнні. Камсамольцы факультэта актыўна ўключыліся ў спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Т. Нічыпарук, А. Класкоўскі, А. Барысевіч узнагароджаны знакамі ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі «За выдатную вучобу». Яны сталі пераможцамі другога этапа спаборніцтва. Мастацкі калектыў лічыцца адным з лепшых ва універсітэце. Паспяхова вядзецца работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў.

Правядзенне Ленінскіх урокаў, урокаў мужнасці, сустрэч з ветэранамі партыі і камсамола, вядомымі журналістамі, пісьменнікамі стала добрай традыцыяй на факультэце. Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі факультэт заняў трэцяе месца, 69 чалавек атрымалі толькі «выдатна».

Разам з тым У. Грыняк звярнуў увагу на асобныя недахопы ў рабоце акадэмічнага сектара. Некалькі студэнтаў маюць дрэнныя



экзаменацыйныя адзнакі і акадэмічныя запазычанасці.

У спрэчках выступілі В. Вараб'ёў, старшыня СНТ факультэта, В. Дудко, камсорг 1-й групы І курса, А. Класкоўскі, член рэдкалегіі факультэцкай газеты «Журналіст» і іншыя.

Дэкан факультэта прафесар Р. Булацкі падкрэсліў, што пастановы партыі ў галіне журналістыкі накіроўваюць нас на рашэнне першаступенных задач: павышэнне якасці падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, трывалае авалоданне тэорыяй марксізму-ленінізму, набыццё моцных ведаў па асновах эканомікі, паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы.

Сход адобрыў план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і дастойнай сустрэчы 60-годдзя Вялікага Кастрычніка: грамадска-палітычныя чытанні, прысвечаныя Кастрычніку, правядзенне Ленінскага ўрока «Рэвалюцыйны трымаем крок», грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС—у жыццё!». Прадугледжана шырэй разгарнуць спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!».

**Н. ЛЕБЕДЗЕВА.**

Фота **А. Басава** і **А. Казака.**

# КАНФЕРЭНЦЫЯ ЛАЎРЭАТАЎ

У адпаведнасці з пастановай сакратарыята ЦК ВЛКСМ і калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у Маскве ў Вышэйшай камсамольскай школе ў пачатку лютага 1977 года праходзіла канферэнцыя лаўрэатаў VI Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

У гэтым конкурсе прынялі ўдзел каля двух мільёнаў студэнтаў з 824 ВНУ нашай краіны.

Аб вялікай цікавасці да грамадскіх навук сведчыць той факт, што на трэці, заключны тур конкурсу былі прадстаўлены 1583 работы. Сярод іх даследаванні па гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму, гісторыі ВЛКСМ і маладзёжнага руху.

У састаў дэлегацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўвайшлі 10 студэнтаў і выпускнікоў, якія ўдзельнічалі ў VI конкурсе. З іх двое былі ўзнагароджаны дыпломам І ступені. Гэта Віталій Жылко, цяпер аспірант кафедры оптыкі фізічнага факультэта — ён пісаў работу па праблемах навуковага камунізму, і Мікалай Зыль, выпускнік гістарычнага факультэта. Яго работа была прысвечана гісторыі ВЛКСМ. Мікалай Галаўко — студэнт IV курса аддзялення палітычнай эканоміі, Людміла Шаўгеня — выпускніца геаграфічнага факультэта, Сяргей Яцкевіч — студэнт-завочнік гістарычнага факультэта былі ўзнагароджаны дыпломамі II ступені. І пяць чалавек, дэлегатаў канферэнцыі, атрымалі Ганаровыя граматы ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

У састаў дэлегацыі ўваходзілі таксама навуковыя кіраўнікі работ, удастоеных дыпломаў І ступені. Гэта выконваючы абавязкі дацэнта кафедры гісторыі КПСС Іван Фёдаравіч Раманоўскі і старшы выкладчык кафедры навуковага камунізму Анатолій Фёдаравіч Уколаў.

Канферэнцыя адкрылася праглядам кінафільма «Аповесць аб камунісце». Перад удзельнікамі канферэнцыі выступілі сакратар ЦК ВЛКСМ В. Жыцянёў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Н. Мохаў.

Назаўтра работа канферэнцыі працягвалася па секцыях. Былі заслуханы цікавыя паведамленні, зробленыя студэнтамі з розных куткоў нашай краіны.

Памятным для ўдзельнікаў канферэнцыі было ўскладанне вянкоў да магілы Невядомага салдата і наведанне Маўзалея Уладзіміра Ільіча Леніна.

Сустрэчы, гутаркі, дыскусіі, азнаямленне з паведамленнямі калег па навуковай рабоце, культурная праграма — усё гэта было вельмі цікавым для ўдзельнікаў канферэнцыі — лаўрэатаў VI Усесаюзнага конкурсу.

**У. ПУЗІКАЎ,**
**член дэлегацыі БДУ.**

# З МЭТАЙ УДАСКАНАЛІЦЬ ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС

**Як знайсці найбольш дзейсную форму кантролю за бягучай паспяховасцю студэнтаў!**

**На філалагічным факультэце БДУ такая форма кантролю знойдзена. У чым яе сутнасць! Што падказвае і ад чаго перасцерагае першы, хоць і невялікі вопыт! Гэтаму прысвечана гутарка з намеснікам дэкана філалагічнага факультэта М. Піпчанкам.**




— МІКАЛАЙ МІХАЙЛАВІЧ, ВУЧЭБНАЯ АТЭСТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ У БДУ ПРАВОДЗІЦЦА ПАКУЛЬ ШТО ТОЛЬКІ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ. ДЗЕ ЗАРАДЗІЛАСЯ ГЭТАЕ КАШТОЎНАЕ ПАЧЫНАННЕ?

— Некаторыя ВНУ краіны ўжо некалькі год практыкуюць такую форму кантролю за бягучай паспяховасцю. Яна прызнана эфектыўнай. Аб гэтым ішла размова на навукова-метадычнай канферэнцыі «Удасканаленне вучэбнага працэсу з улікам айчыннага і замежнага вопыту», якая праходзіла ў 1975 годзе ў Маскве. Узнікла жаданне на ўласным вопыце пераканацца, наколькі эфектыўнай з'яўляецца вучэбная атэстацыя як форма кантролю за бягучай паспяховасцю.

У ЧЫМ ЯЕ СУТНАСЦЬ?

— На кожным курсе створана вучэбна-метадычная камісія. У яе ўваходзяць некалькі выкладчыкаў, якія працуюць на гэтым курсе, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый (старасты груп, курса, адказныя за акадэмічную работу). Кіруючыся тымі ацэнкамі, якія выстаўляюць выкладчыкі, камісія вырашае, атэставаць ці не атэставаць студэнта па пэўнаму прадмету.

Але гэта не самамэта. Перад намі стаіць задача выявіць сапраўдны ўзровень ведаў, заахвоціць студэнтаў. Студэнт, не атэставаны па ўсіх прадметах, які сістэматычна прапускае заняткі, можа быць выключан з ВНУ. Іншымі мерамі пакарання з'яўляюцца строгая вымова з паведамленнем бацькам і пазбаўленне стыпендыі. Такім студэнтам указваецца не неабходнасць удзяляць больш увагі прадметам, па якіх яны не атэставаны.

У адносінах да студэнтаў, якія добра зарэкамендавалі сябе ў час вучэбнай атэстацыі, прымаюцца меры заахвочвання; акрамя таго, некаторым назначаецца павышаная стыпендыя.

— ЯКІЯ АДНОСІНЫ САМІХ СТУДЭНТАЎ ДА ВУЧЭБНАЙ АТЭСТАЦЫІ?

— Гэта мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць. Калі падагульнялася першая атэстацыя, студэнты з нецярплівасцю чакалі вынікаў вучэбна-метадычнай камісіі.

— ШТО АТЭСТАЦЫЯ ДАЛА ВЫКЛАДЧЫКАМ?

— Вельмі многае. У час практычных заняткаў можна ацаніць падрыхтаванасць студэнта па асобных прадметах. А пры атэстацыі выразна выступае агульная яго падрыхтоўка, узровень ведаў усёй групы, цэлага курса. (Па выніках атэстацыі ў мінулым годзе першае месца заняў II курс). Пры гэтым улічваецца працэнт атэставаных і неатэставаных студэнтаў і сярэдні бал.

— ЯК ЧАСТА ПРАВОДЗЯЦЦА АТЭСТАЦЫІ?

— Гэта залежыць ад колькасці і ёмістасці практычных заняткаў: ці дастаткова іх для таго, каб можна было меркаваць аб узроўні ведаў, аб падрыхтаванасці студэнтаў. У другім семестры на факультэце мяркуецца правесці дзве вучэбныя атэстацыі. А ў гэтыя дні падводзяцца вынікі атэстацыі першага семестра.

Вучэбнае мерапрыемства прыносіць карысць. У ВНУ краіны справа гэта пастаўлена шырэй. А ў Харкаўскім універсітэце, напрыклад, вынікі атэстацыі падагульняюцца з дапамогай ЭВМ.

Мы таксама мелі б такую магчымасць, калі б вучэбная атэстацыя практыкавалася ў маштабах усяго універсітэта. А пакуль мы не маем базы, тэхнічных сродкаў.

Вучэбная атэстацыя з разраду эксперыментаў паступова пераходзіць у разрад традыцыйных. Традыцыя гэта будзе жыць. Тым больш, што ВНУ да гэтага часу не знайшлі больш эфектыўнай формы кантролю за бягучай паспяховасцю.

**Гутарку вяла А. ГУБІЧ,**
**студэнтка журфака.**

# ЗА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНЦКІХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Навукова-даследчая работа студэнта (НДРС) як від даследчай дзейнасці і як адна з падсістэм ВНУ набыла ў цяперашні час значэнне аднаго з эфектыўных шляхоў паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў. Зараз у краіне ўжо ў асноўным склалася структура НДРС і сістэма кіравання ёю ў выглядзе ўсесаюзнага, рэспубліканскага, абласных, ВНУ, факультэцкіх саветаў па НДРС.

Параўнальны аналіз розных форм НДРС у адпаведнасці з тыпам ВНУ і спецыяльнасцю паказвае, што выбар і развіццё канкрэтных арганізацыйных форм залежаць як ад спецыфікі галіны навуковага ведання і традыцыйных форм арганізацыі НДР, якія склаліся ў гэтай галіне, так і ў немалой ступені ад традыцый развіцця навукова-даследчай сістэмы ВНУ. Гэта пацвярджаецца наяўнасцю трох падыходаў пры выбары арганізацыйных форм НДРС ВНУ. Першы падыход звязан з арыентацыяй на поўную прывязку НДРС да склаўшыхся ў ВНУ ці ў галіне ведаў арганізацыйных форм НДР (напрыклад, Томскі політэхнічны інстытут, МФТІ). Другі падыход прама супрацьлеглы і звязан з арыентацыяй на развіццё самастойных студэнцкіх навукова-даследчых падраздзяленняў (напрыклад, Уфімскі нафтавы інстытут). І, нарэшце, трэці падыход — змешаны, ён рэалізуецца большасцю ВНУ.

Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна належыць да трэцяга тыпу ВНУ. Яго студэнты ўдзельнічаюць як у рабоце гурткоў, студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ), студэнцкіх вылічальных цэнтраў (СВЦ), так і ў навуковай рабоце кафедр і лабараторый. Усімі формамі НДРС ва універсітэце кіруе савет па НДРС і НСС (навуковы студэнцкі савет).

У 1975—1976 гг. у БДУ назіраўся прыкметны рост колькасці студэнтаў, прыцягнутых да НДРС. Напрыклад, у 1970 г. НДР займаліся 2500 чалавек, а ў 1976 г. — 7239, што склала 75 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання. Адпаведна ўзраслі і колькасныя паказчыкі эфектыўнасці НДРС. Так, аб'ём гасдагаворных работ, выкананых студэнтамі ў 1976 годзе, у параўнанні з 1975 г. павялічыўся з 216,6 тыс. рублёў да 235,5 тыс. Колькасць публікацый за гэты ж перыяд павялічылася з 749 да 853; колькасць курсавых і дыпломных работ, выкананых па заданню прамысловасці, узрасла з 358 (прынята да ўкаранення 28) да 535 (прынята да ўкаранення 36). Такім чынам, аналіз асноўных паказчыкаў дае магчымасць зрабіць вывад, што сістэма НДРС у БДУ імя У. І Леніна развіваецца паспяхова. Аднак гэта не азначае, што ў развіцці НДРС няма праблем. Прыкладам таму можа служыць зніжэнне ў 1976 годзе такога важнага паказчыка эфектыўнасці НДРС, як колькасць удзельнікаў у рэспубліканскім конкурсе па прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навуках і ўдзельная вага работ, аднесеных да І катэгорыі. Гэта сведчыць аб наяўнасці пэўных цяжкасцей у арганізацыі НДРС, якія яшчэ чакаюць свайго рашэння.

**В. КАЧЭРГІН,**
**старшы навуковы супрацоўнік праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў.**



**Добрай традыцыяй на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна сталі сустрэчы з былымі выпускнікамі.**

**У гасцях на факультэце часта бываюць пісьменнікі, паэты, журналісты, работнікі кіно. Студэнты сустракаліся з П. Місько, І. Шамякіным, А. Макаёнкам, В. Дашуком і многімі іншымі.**

**Зусім нядаўна госцем факультэта журналістыкі быў паэт Генадзь Бураўкін. Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі аб паездцы ў Злучаныя Штаты Амерыкі, расказаў аб рабоце ў часопісе «Маладосць», прачытаў новыя вершы, падзяліўся сваімі творчымі планамі.**

**У ходзе гутаркі Генадзь Бураўкін адказаў на пытанні студэнтаў. Паэт азнаёміўся з фотавыстаўкамі.**

**Л. НАДЗЕЖДЗІНА.**

# КЛУБ АМАТАРАЎ ТЭАТРА

**«НАВАТ САМАЯ СУЧАСНАЯ НАВУКОВАЯ ПАДРЫХТОЎКА БЕЗ АДПАВЕДНАГА МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ВЯДЗЕ ДА ГОЛАГА ПРАГМАТЫЗМУ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЙ ВУЗКАСЦІ І ФАРМАЛЬНА-СЛАВЕСНАМУ ЗАСВАЕННЮ КУЛЬТУРЫ».**

(Са справаздачнага даклада ЦК КПБ XXVIII з'езду КПБ).

З мэтай далучэння максімальнай колькасці студэнтаў універсітэта, будучых «рассаднікаў культуры», да маральна-духоўных каштоўнасцей пачаў сваю работу ў гэтым навучальным годзе «Клуб аматараў тэатра» (КАТ) пры камітэце камсамола БДУ. Кіруе работай КАТ савет пры сектары ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання камітэта камсамола. Клуб складаецца з некалькіх секцый — прапарцыянальна колькасці тэатраў у горадзе. Пераважна на дагаворнай аснове афармлены сувязі ўсіх факультэтаў універсітэта з тэатрамі горада. Мяркуецца наведванне спектакляў, іх абмеркаванне, сустрэчы, вечары, метадычная дапамога тэатраў факультэцкім калектывам мастацкай самадзейнасці, сустрэчы з дзеячамі мастацтва і культуры наогул.

Дагаворы заключаюцца на год з тым, каб на наступны год адбылася іх змена. Гэта значыць, за 5 год навучання ва універсітэце студэнт будзе мець магчымасць азнаёміцца з рэпертуарам, планамі калектываў усіх тэатраў горада.

Ідэя стварэння клуба была закладзена яшчэ год назад у дагаворы аб супрацоўніцтве калектываў Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР і БДУ імя У. І. Леніна. Супрацоўніцтва з оперным тэатрам — доўгатэрміновае. У плане работы КАТ не толькі наведванне спектакляў у тэатры оперы і балета, прадугледжаных абанементам. Запланаваны сустрэчы з вядучымі акцёрамі тэатра, вечары пытанняў і адказаў, абмеркаванні спектакляў, так неабходныя творчаму калектыву тэатра. Прадугледжаны каментарыі пастановак (перад іх пачаткам) мастацтвазнаўцы тэатра. Сустрэчы ж з вядучымі выканаўцамі будуць арганізоўвацца праз некалькі дзён пасля прагляду спектакля.

Клуб разлічан у асноўным, на студэнтаў малодшых курсаў, уся яго работа мяркуецца быць перспектыўнай. Бо ісціннае разуменне цудоўнага, калі хочаце, цяга да яго прыходзяць не адразу. Іх трэба выхоўваць. Не, мы не прыхільнікі такога «масавага культпаходнага выхавання» і толькі яго. Але, згадзіцеся, выхаваўчы працэс — двухбаковы, двуадзіны. Чалавек выхоўваецца як пад уздзеяннем суб'ектыўных фактараў, так і аб'ектыўных умоў. Стварэнне клуба і з'яўляецца спробай некаторага ўплыву аб'ектыўных умоў на фарміраванне духоўна-маральнага свету асобы. Але, зразумела, нават грунтоўна распрацаваны тэатральны абанемент, нават шматлікія тэатральныя сустрэчы — не панацэя ад усіх бед.

Дапамагчы разумець свет цудоўнага можа, безумоўна, не адзін толькі тэатр.

Але на тое ён і пошук, на тое ён і першы крок, каб на ім не спыняцца.

**Н. ШАЎЧЭНКА,**
загадчык культурна-масавага сектара камітэта камсамола БДУ.

РАМПА

# Вучымся разумець Цудоўнае

Скажыце, вам цікава даведацца аб пачуцці Тарэра-Пясцехіна, які робіць першыя «па» пры выхадзе на сцэну? Вам цікава пачуць аб успрыманні Евай-Сінельнікавай кульмінацыйнай сцэны «Стварэнне свету» — сцэны Кахання? Безумоўна!

Так маглі б адказаць усе ўдзельнікі сустрэчы з акцёрамі тэатра оперы і балета, якая праходзіла ва універсітэце. Гэта Людміла Сінельнікава, Уладзімір Камкоў, Сяргей Пясцехін і балетмайстар - пастаноўшчык Дзіна Маркаўна Арына.

Маладыя артысты балета расказалі нам аб сваіх творчых біяграфіях, пошуках і знаходках, аб спецыфіцы работы артыста балета.

Мы сустрэліся з тымі, чыёй мовай гаворыць само Цудоўнае, з тымі, хто гэта Цудоўнае беражліва, як вышэйшы падарунак, нясе нам са сцэны. Яшчэ адна старонка ўпісана ва ўспрыманне намі Цудоўнага.

**В. ЛАДУЦЬКА.**

## Былі канікулы

# КАРПАТЫ—ГОРЫ МЯККІЯ

Далёка не першы год праводзяць на Карпатах свае зімовыя канікулы студэнты геаграфічнага факультэта. Сёлета там быў і я. Карпаты для мяне не першыя горы. Да гэтага давялося пабываць на Цянь-Шані, Паміра-Алаі, Урале, Каўказе, захапляцца гарамі паўночнага ўсходу Якуціі.

Любыя горы, безумоўна, прыгожыя, але Карпаты — па-свойму. Яны тояць у сабе вялізнае царства лесу, пакатыя схілы. Тут амаль адсутнічаюць скалістыя ўчасткі. У адрозненне ад тых гор, якія я бачыў раней, Карпаты — мяккія. У гэтым і заключаецца гэта самае «сваё», асаблівае.

Знаёміцца з гэтымі гарамі наша група, у састаў якой уваходзілі студэнты геафака, хімфака і біяфака, пачала з закарпацкага горада Рахава. Горад стаіць у горнай чашы, якая разразаецца напалам хуткай і шумлівай Цісай. З Рахава нам належала падняцца на турысцкі прыют «Брэцкул», на вышыню 1450 м над узроўнем мора. Пад'ём нялёгкі. Але вось мы не «Брэцкуле». Тут нас сустрэла другая група турыстаў. Традыцыйнае прывітанне і, як узнагарода за цяжкі пераход, — гарачы чай. Адпачынак. Яму мы прысвяцілі ўвесь наступны дзень. Агледзеліся, заўважылі наўкола шмат цікавага. Сам прыют размешчан на прыгожым схіле. У бязвоблачнае надвор'е адсюль добра бачны дзве вышэйшыя вяршыні Украінскіх Карпат: гара Гаверла (2061 м) і гара Петрас (2020 м).

Увесь дзень адпачынку прайшоў на лыжні. Пасля вячэры ў цесным пакойчыку загучалі песні Арыка Крупа, Сяргея Нікіціна і Ландсберга ў выкананні нашага Колі Ігнаценкі. Затым бяруць гітару масквічы, чэлябінцы...

Гэты канцэрт працягваўся б яшчэ доўга, але — адбой. Заўтра ўзыходжанне на Гаверлу. Для многіх удзельнікаў паходу гэта — першае пакарэнне вяршыні. Ім цяжка. Уся група стараецца падстройвацца пад іх тэмп. Ідзём... Вось і былая, да 1940 года, дзяржаўная граніца з Румыніяй. Застаўся апошні, але самы цяжкі кіламетр. Апошні пераход — і мы на вяршыні. Гаверла пакорана!

Другая частка нашага паходу была звязана з прыютам «Пералесак», куды мы адправіліся пасля «Брэцкула». Усё было б добра, калі б не надвор'е. Яно нас не мілавала. На працягу трох дзён лютавала пурга, нельга было нават катацца на лыжах. А ў апошні дзень, калі мы вярталіся ў горад, пайшоў... дождж. Мы прамоклі да ніткі, але ўсё роўна былі ў добрым настроі.

Паход наш завершан. Канчаюцца канікулы. Сумна і цяжка расставацца з новымі сябрамі, сумна пакідаць горы. Бывайце, Карпаты. Чакайце нас у наступным годзе!

**А. ЛАШУК,**
**студэнт V курса геафака.**

# СТУДЭНТ З ВЯЧЭРНЯГА

Канчаецца рабочы дзень. Людзі спяшаюцца дахаты, іх чакае адпачынак пасля доўгіх гадзін работы. Але дапазна не гасне святло ў вокнах універсітэта. Сюды, на змену шумлівым, заўсёды заклапочаным студэнтам дзённага аддзялення прыходзяць сур'ёзныя і нетаропкія студэнты-вячэрнікі.

Як правіла, у людзей, якія займаюцца на вячэрнім аддзяленні, за плячыма не адзін год працоўнай дзейнасці. Яны добра ведаюць, што такое стомленасць пасля рабочага дня. Кожны з іх ужо паспеў адчуць радасць першага заработку. І першыя жыццёвыя цяжкасці і няўдачы ў іх ужо таксама ззаду.

Што ж прывяло гэтых, ужо вызначыўшыхся ў жыцці людзей на студэнцкую лаўку?

«Жаданне ведаць больш і імкненне да самаўдасканалення», — так адказвае студэнт III курса вячэрняга аддзялення фізфака Сяргей Грыневіч. Вось ужо паўгода ён працуе ва універсітэце на кафедры ядзернай фізікі. Работа ў яго цікавая і перспектыўная. Зразумела, што ўдзел у стварэнні і пошуках новага — у любой рабоце патрабуе вялікіх ведаў. Да гэтага і імкнецца Сяргей Грыневіч. Бо пры ўсёй сваёй занятасці ён займаецца на «выдатна».

Слова «выдатнік» звязана звычайна з вобразам невысокага, хударлявага студэнта, абавязкова ў акулярах і заўсёды з кніжкай. Я была прыемна здзіўлена, калі ўбачыла высокага, усміхаючагася маладога чалавека з адкрытым, вясёлым тварам. Як сказаў потым Сяргей, спорт (а ён захапляецца плаваннем і лыжамі) павінен займаць зусім не апошняе месца ў жыцці студэнта.

Часам сярод студэнцтва можна пачуць думку, што вячэрняе аддзяленне дае менш ведаў, чым дзённае. Сяргей так не думае. Наадварот, ён лічыць, што вячэрняе аддзяленне дае больш аб'ёмную адукацыю і адначасова — магчымасць набыць практычныя навыкі ў рабоце.

Асноўная цяжкасць для студэнтаў вячэрняга аддзялення — гэта недахоп часу. Перадолець яе можна толькі за кошт дасканалага раскладу дня. Але нават у сваім вельмі сціслым раскладзе знаходзіць Сяргей месца і для захапленняў, для хобі, як гавораць цяпер. Для яго гэта электроніка і.., як ні дзіўна, пры ўсёй яго занятасці—камерная музыка. Бо выпускнік БДУ, спецыяліст з дыпломам інжынера, павінен мець шырокі кругагляд, рознабаковыя веды сапраўднага інтэлектуала незалежна ад таго, дзённае ці вячэрняе аддзяленне ён скончыў. Ці не так?

**В. МІРГАЯЗАВА.**



# НАПЕРАДЗЕ—БАРАЦЬБА

Каля двух тыдняў працягваецца першынство універсітэта па баскетболу. У падгрупах (а іх чатыры: дзве жаночыя і дзве мужчынскія) ужо вызначыліся лідэры і аўтсайдэры. Без паражэнняў ідуць жаночыя каманды геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў, у мужчын — фізічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў і факультэта радыёфізікі.

Хутка гульні ў падгрупах закончацца. Разгорнецца барацьба за прызавыя месцы паміж лідэрамі падгруп.

**Я. ДУБРОЎСКІ.**

**НА ЗДЫМКУ:** лідэр каманды журфака Таццяна МІКУЛОВІЧ.

Фота А. БАСАВА.

# У ГАСЦЯХ—ГЕРОІ

**Напярэдадні 59-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту да студэнтаў факультэта журналістыкі прыйшлі Героі Савецкага Саюза Ф. Я. Басаў, Д. П. Жмуроўскі, Р. Н. Мачульскі.**

**Пра станаўленне нашых Узброеных Сіл, баявыя аперацыі пачатку і сярэдзіны Вялікай Айчыннай вайны расказаў былы камандзір палка Фёдар Яўсеевіч БАСАЎ.**

**Аўтар «Партызанскай энцыклапедыі», пісьменнік Р. Н. МАЧУЛЬСКІ пазнаёміў студэнтаў з гісторыяй стварэння кнігі «Вечны агонь». З вялікім хваляваннем успамінаў ветэран баявыя гады беларускіх партызан.**

**Вельмі цёпла быў сустрэт прафесар Д. П. ЖМУРОЎСКІ. У гады вайны ён — першы нумар кулямётнага разліку, а цяпер Герой Савецкага Саюза — выкладчык гісторыі КПСС на факультэце.**

**Баявыя ўспаміны, словы ўдзячнасці, кветкі — сустрэча надоўга застанецца ў сэрцах будучых журналістаў.**



**НА ЗДЫМКАХ:** выступае Герой Савецкага Саюза Ф. Я. Басаў; Героі Савецкага Саюза Р. Н. Мачульскі і Д. П. Жмуроўскі.

Фота А. КАЗАКА і А. БАСАВА.



# ПАЛАЖЭННЕ

## ПА ПРАВЯДЗЕННЮ МЕСЯЧНІКА НА ЛЕПШЫ СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАТ У ГОНАР 60-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Месячнік праводзіцца прафкомам, камітэтам камсамола, дырэкцыяй студгарадка і адміністрацыйна-гаспадарчай часткай з 1 па 31 сакавіка 1977 года. Адказнасць за выкананне умоў месячніка ўскласці на камендантаў інтэрнатаў, старшынь студсаветаў, адміністрацыю студгарадка, стараст пакояў і паверхаў.

### УМОВЫ МЕСЯЧНІКА

Пераможцай у ходзе месячніка лічыцца той інтэрнат, які выканаў наступныя ўмовы:

прапаганда ідэй савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму; вывучэнне і папулярызацыя жыцця і дзейнасці вядомых дзеячаў міжнароднага камуністычнага і рабочага руху; правядзенне лекцый па гісторыі Савецкай дзяржавы, аб міжнародным становішчы, лекцый і гутарак, прысвечаных ленінскай нацыянальнай палітыцы, арганізацыя сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі, героямі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, з перадавікамі вытворчасці;

шырокая інфармацыя аб рашэннях партыі і ўрада;

афармленне ленінскіх пакояў;

сустрэчы з кампазітарамі, скульптарамі, мастакамі і артыстамі, вечары пытанняў і адказаў, вечары-дыспуты, канферэнцыі чытачоў, лекцыі аб мастацтве;

прытрымліванне санітарна-гігіенічных норм у пакоях інтэрната, добрае функцыяніраванне ўсіх служб быту, якія маюцца ў інтэрнаце, захаванне сацыялістычнай уласнасці;

захаванне жыхарамі інтэрнатаў высокай культуры быту.

### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

Інтэрнат, які заняў 1-е МЕСЦА, па выніках месячніка ўзнагароджваецца пераходным вымпелам, Ганаровай граматай рэктарата, камітэта камсамола і прафкома, каштоўным падарункам (магнітафон), 2-е МЕСЦА — Ганаровай граматай і каштоўным падарункам (фотаапарат), 3-е МЕСЦА — Ганаровай граматай і каштоўным падарункам (прайгравальнік).

Старшыні студсаветаў інтэрнатаў, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца бясплатнымі пуцёўкамі ў прафілакторый.

**ПРАФКОМ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**

**Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» выказвае глыбокае спачуванне студэнту факультэта журналістыкі, супрацоўніку шматтыражнай газеты універсітэта А. ПРАНІШНІКАВУ з выпадку смерці яго БРАТА.**

**В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.**

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 338. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 01105